ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 17 (1053) ● Чацвер, 16 мая 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

Насустрач 30-годдзю вызвалення Беларусі

## НІШТО НЕ ЗАБЫТА...

Удзельнікі аперацыі «Вызваленне» прайшлі па месцах баёў 50-й арміі 2-га Беларускага фронту.

Падрыхтоўка да паходаў пачалася даўно. Былі створаны дзве групы са студэнтаў гістарычнага факультэта, якія сабралі матэрыялы аб гэтай арміі. Потым студэнты-гісторыкі разам з турысцкім клубам БДУ вызначылі маршруты; шляхамі байцоў-вызваліцеляў пайшлі тры групы турыстаў.

Рабяты сустрэліся з удзельнікамі баёў, з цікавымі людзьмі, перадавікамі працы. У сваю чаргу яны выступілі з лекцыямі аб геraічным шляху 50-й арміі. Вельмі спатрэбіліся ім у гэтым матэрыялы, сабраныя ў час падрыхтоўкі.

Зараз студэнты-гісторыкі афармляюць альбомы аб паходах.

## У ПАРТКОМЕ

Учора на пасяджэнні партыйнага камітэта разгледжаны наступныя пытанні: аб рабоце партыйнага бюро па паляпшэнню дзейнасці куратараў на юрыдычным факультэце; аб кіраўніцтве партыйнымі бюро дзейнасцю добраахвотных народных дружын гістарычнага і фізічнага факультэтаў; аб гатоўнасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў да ўдзелу ў сёлетнім працоўным семестры; аб правядзенні справаздачна-выбарных сходаў у пярвічных партыйных арганізацыях.

* * *

Пры абмеркаванні работы куратараў на юрыдычным факультэце адзначана, што гэтыя абавязкі выконваюць 33 выкладчыкі: 25 на стацыянары, пяць — на вячэрнім аддзяленні, тры — на падрыхтоўчым. Сярод іх два прафесары, 23 дацэнты і кандыдаты навук, восем — старшыя выкладчыкі. Куратарамі працуюць старшыняра і вячэрняга аддзялення. У прафбюро, намеснік дэкана, намеснік сакратара партбюро.

У гэтым годзе куратары арганізавалі два дыспуты, правялі шэраг культпаходаў у музеі, тэатры, кіно.

З ліку студэнтаў старэйшых курсаў падрыхтавана 27 лектараў; яны прачыталі ўжо 92 лекцыі.

Рэгулярна кожны тыдзень у акадэмічных групах праводзяцца палітінфармацыі па рэкамендаванай тэматыцы.

Работа куратараў рэгіструецца ў спецыяльным журнале.

Уся дзейнасць куратараў накіравана на паляпшэнне вучэбна-выхаваўчага працэсу. І як вынік—факультэт заняў першае месца па паспяховасці (98 працэнтаў) і наведванню заняткаў.

Партыйнае бюро двойчы ў гэтым годзе заслухоўвала пытанне аб рабоце куратараў I—IV курсаў стацыянара і вячэрняга аддзялення. У лютым адбыўся семінар на тэму «Роля куратара акадэмічнай групы ў ідэйным выхаванні студэнтаў». У сакавіку праведзена нарада куратараў I і II курсаў. Прафбюро абмеркавала работу настаўнікаў моладзі на падрыхтоўчым аддзяленні і на малодшых курсах вячэрняга аддзялення.

Адзначыўшы станоўчае ў кіраўніцтве добраахвотнымі народнымі дружынамі на фізічным і гістарычным факультэтах, партком звярнуў увагу на тое, што на абодвух факультэтах большасць сярод дружыннікаў—студэнты малодшых курсаў, дапушчаны парушэнні палажэння аб ДНД пры назначэнні камандзіраў, на гістфаку меў месца зрыў дзяжурства па ахове грамадскага парадку.

Па ўсіх абмеркаваных пытаннях партком прыняў дзейсныя рашэнні.

## Выконваючы абавязацельствы

На пасяджэнні прафбюро юрфака заслухана справаздача выкладчыкаў кафедры гісторыі дзяржавы і права БССР і кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва аб ходзе выканання сацыялістычных абавязацельстваў. Прадстаўнікі кафедр расказалі аб дадатковай навуковай працы, распрацоўцы метадычных дапаможнікаў, прапагандзе прававых ведаў сярод насельніцтва.

На кафедры гісторыі дзяржавы і права БССР падрыхтавана некалькі артыкулаў для БСЭ, зборнік «Заканадаўчых актаў па гісторыі дзяржавы і права БССР», навуковыя артыкулы.

Вялікая работа праведзена і на другой кафедры вучонымі-юрыстамі. На маючай адбыцца ў маі ў Кішынёве Усесаюзнай навуковай канферэнцыі па праблеме ўдасканалення дзяржаўнага кіраўніцтва сельскагаспадарчымі аб'яднаннямі з дакладамі выступяць загадчык кафедры доктар юрыдычных навук А. А. Галаўко і кандыдат юрыдычных навук М. Ф. Сцепанко. Падрыхтаваны даклады на рэспубліканскую навуковую канферэнцыю па праблемах вышэйшай завочнай адукацыі. У мінулым месяцы на сумесным пасяджэнні з кафедрай дзяржаўнага права Вільнюскага універсітэта з дакладам, у якім узнята праблема гарантыі забеспячэння правоў мясцовых Саветаў у галіне сельскай гаспадаркі, выступіў А. А. Галаўко.

Прафбюро адзначыла плённы ўдзел выкладчыкаў кафедр у прапагандзе прававых ведаў сярод насельніцтва і той вялікі аб'ём грамадскай работы, які яны правялі з пачатку года. Традыцыйнымі сталі выступленні вучоных-юрыстаў на Беларускім рэспубліканскім радыё.

**У. СЯРЭБРАНІКАЎ,**
**дацэнт юрфака, член прафбюро.**

## АБ СПРАВАХ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

На пленуме камітэта камсамола БДУ, прысвечаным рабоце з першакурснікамі, прысутнічалі члены камітэта, сакратары факультэцкіх бюро, адказныя за акадэмічную работу ў факультэцкіх бюро, камсоргі першых курсаў.

З дакладам аб стане акадэмічнай работы выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па вучэбна-навуковай рабоце Р. Янчылік. У дакладзе станоўча адзначана работа грамадскага дэканата на філалагічным факультэце, акадэмічнай камісіі гістарычнага факультэта, акадэмічнага сектара геаграфічнага факультэта.

Прааналізаваны вынікі паспяховасці па грамадскіх навуках. Яны несуцяшальныя, што сведчыць аб слабай падрыхтоўцы студэнтаў першых курсаў да сесіі.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел: студэнтка філалагічнага факультэта, дэкан грамадскага дэканата Д. Трэбухоўская; студэнтка IV курса матэматычнага факультэта, грамадскі куратар Л. Траццякова; Л. Цюлюпаў, студэнт I курса ФПМ; члены камітэта камсамола.

Выступіўшыя ў спрэчках адзначылі неабходнасць аддаваць больш увагі падрыхтоўцы першакурснікаў да сесіі, арганізацыі кансультацый як па грамадскіх навуках, так і па спецыяльных; прымацаванню студэнцкіх груп старэйшых курсаў у якасці куратараў да груп першых курсаў, перадачы вопыту акадэмічнай работы малодшым курсам.

Сакратар камітэта камсамола У. А. Навумовіч у сваім выступленні адзначыў, што работу па выхаванню высокакваліфікаваных спецыялістаў неабходна пачынаць з падрыхтоўчых курсаў, з прафарыентацыі вучняў падшэфных школ, з работы са «школамі юных», з правядзення алімпіяд сярод школьнікаў.

Пленум пастанавіў: для паляпшэння акадэмічнай работы на першых курсах стварыць на ўсіх факультэтах вучэбна-выхаваўчыя камісіі з падпарадкаваннем іх вучэбна-выхаваўчай камісіі пры камітэце камсамола універсітэта; факультэцкім бюро і акадэмічным камісіям рэгулярна разглядаць пытанні паспяховасці і наведвання; рэгулярна праводзіць вучобу адказных за акадэмічную работу; арганізаваць конкурс на лепшую групу першага курса з асвятленнем вынікаў конкурсу ў насценным друку.

У мэтах кантролю за выкананнем рашэнняў данага пленума ў лістападзе 1974 года пытанне аб рабоце з першакурснікамі будзе заслухана на пасяджэнні бюро камітэта камсамола БДУ.

**У. ПУЗІКАЎ,**
**член бюро камітэта камсамола універсітэта.**

## *19 мая—дзень нараджэння піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна*



Шмат карыснага, цікавага прыносіць плённая сувязь вну і школы. Студэнты з задавальненнем працуюць у дзіцячых пакоях пры домакіраўніцтвах, выязджаюць з гутаркамі і канцэртамі ў школы. Піянеры ў сваю чаргу часта прыходзяць у госці на факультэты.

**На здымку:** з заалагічным музеем школьнікаў знаёміць студэнтка біяфака А. Пікулік.

**(Працяг на 3-й стар.).**

### АДВУДЗЕЦЦА ПЛЕНУМ

**Камітэт камсамола БДУ рыхтуецца да чарговага пленума. Камсамольскія важакі універсітэта абмяркуюць пытанне «Камуністычнае выхаванне моладзі ў святле рашэнняў XVII з'езда ВЛКСМ і XXV з'езда ЛКСМБ».**

**У камсамольскіх групах усіх факультэтаў будуць праведзены сходы з абмеркаваннем матэрыялаў з'ездаў.**

### ДАЁШ КАМСАМОЛЬСКІ ГОРАД!

Для байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў стала традыцыяй у час падрыхтоўчага перыяду выходзіць на суботнікі і нядзельнікі.

У час работы XVII з'езда ВЛКСМ байцы СБА імя Ленінскага камсамола БДУ звярнуліся да ўсіх студэнцкіх будаўнічых атрадаў Беларускай ССР з заклікам азнаменаваць дні работы з'езда ўдарнай працай на камсамольскім нядзельніку і пералічыць заробленыя сродкі ў фонд будаўніцтва камсамольскага горада Гагарына. Самі байцы гэтага атрада на чале з камандзірам В. Карагіным і камісарам В. Дашковічам працавалі ў будаўніча-мантажным упраўленні «Мінскрадыёбуд».

### ВЫНІКІ ГОДА РОСТУ

**На адкрытым партыйным сходзе філалагічнага факультэта абмеркавана работа камітэта камсамола факультэта ў бягучым годзе. Член партбюро І. А. Рабчынская адзначыла, што гэты навучальны год для камітэта з'явіўся годам росту. У яго складзе працуюць ініцыятыўныя, цікаўныя людзі. Амаль усе сектары знайшлі ці шукаюць новыя формы работы.**

**Добра зарэкамендаваў сябе грамадскі дэканат, створаны пры акадэмічным сектары. Пашырыў свае сувязі сектар інтэрнацыянальнай работы. Прыцягваюць многіх справы клуба «Лігатур» Шэфскі сектар наладжвае работу клуба «Сэрца аддаю дзецям».**

**Як станоўчае адзначана імкненне камітэта, яго сектараў шукаць новыя формы работы.**

### УВАГА— АБІТУРЫЕНТУ

**Рыхтуецца да сустрэчы абітурыентаў-74 камітэт камсамола універсітэта. Як і раней, у летнія месяцы будзе працаваць грамадская прыёмная камісія. У гэтым годзе адказвае за яе работу студэнтка III курса аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта Дзіана Смагіна, дэкан грамадскіх падрыхтоўчых курсаў. Часта сустракаецца яна са студэнтамі, членамі грамадскай прыёмнай камісіі, праводзіць кансультацыі па пытаннях арганізацыі летняй работы.**

### ПАДПІСАН ДАГАВОР

У камітэце камсамола адбылося падпісанне дагавору аб абмене студэнцкімі будаўнічымі атрадамі летам гэтага года паміж БДУ і Патсдамскай вышэйшай школай. Дагавор падпісалі намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце Валянцін Андруховіч і сакратар Саюза свабоднай нямецкай моладзі Фолькер Поль.

**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# ЗАКЛЮЧНЫ ТУР — У МАСКВЕ

На фізічным факультэце два дні працягвалася рэспубліканская алімпіяда па фізіцы. У ёй прынялі ўдзел студэнты I—IV курсаў вну Беларусі, дзе выкладаюцца фізічныя дысцыпліны.

Мэта алімпіяды, як адзначыў член аргкамітэта старшы інжынер кафедры агульнай фізікі Л. І. Бураў, з аднаго боку, выявіць найбольш здольных студэнтаў, з другога, далучыць іх да навукі.

Мацнейшы студэнт пазбаўляецца зацікаўленасці да працы, калі ён увесь час арыентуецца на сярэдняга студэнта. Алімпіяда ж развівае яго здольнасці, дае магчымасць адчуць смак прафесіі.

58 удзельнікам алімпіяды былі прапанаваны пяць пытанняў і задач па фізіцы.

Пасля падвядзення вынікаў быў зроблен аналіз рашэнняў задач і праведзена гутарка з пераможцамі.

Восенню ў Маскву для ўдзелу ў заключным туры алімпіяды па фізіцы «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» паедзе пяць чалавек. Сярод іх — прадстаўнікі фізфака БДУ В. Крылоў (IV курс), А. Лосеў (IV курс), І. Фаін (III курс).

С. ШЫДЛОЎСКАЯ,



# АДНОЙ СЯМ'ЁЮ

У час агляду мастацкай самадзейнасці, на якім студэнты філфака выступалі вельмі добра, многія цікавіліся, а як жа ў гэтых «артыстаў» абстаяць справы з вучобай. Бо як хітра ні сумяшчай вучобу з заняткамі ў хоры, у студэнцкім тэатры, у розных гуртках, усё роўна часу не будзе хапаць. Я, праўда, не бачу адваротнай залежнасці паміж вучобай і самадзейнасцю, але пазнаёміцца са справамі факультэта было, безумоўна, цікава.

**І вось практычныя заняткі** па філасофіі ў другой групе II курса аддзялення рускай мовы і літаратуры — у адной з самых лепшых груп на факультэце па паспяховасці і грамадска-палітычнай рабоце. Заняткі вядзе Ала Віктараўна Баркоўская.

—... Прадоўжым нашу размову па тэме «Вобраз і знак». Хто жадае адказваць?

Адразу бачна, што падрыхтаваны тут добра. Выступленні грунтоўныя. Ніхто не адмаўляецца ад адказу, па ходу якога прыводзяцца цікавыя прыклады, час ад часу ўспыхваюць спрэчкі. Увогуле, адчуваецца зацікаўленасць прадметам. Праўда, прадмет новы, студэнты яшчэ не зусім асвоіліся з філасофскай тэрміналогіяй, таму бываюць часам і памылкі.

Ала Віктараўна не перашкаджае студэнтам выказвацца. Яна ўважліва слухае, папраўляе, дапаўняе, накіроўвае думкі ў патрэбнае рэчышча.

На перапынку падыходжу з пытаннем, як падабаецца група?

— Група моцная. Прадмет ведаюць нядрэнна. З такімі цікава займацца, — адказвае яна.

**Пасля заняткаў** размаўляем з дзяўчатамі. Іх тут большасць. Даведваюся, што з 30 чалавек 8 — выдатнікі. Астатнія займаюцца на «4» і «5».

— У чым сакрэт нашых поспехаў?—перапытвае стараста групы выдатніца Наташа Кожухава. — Проста, відаць, усе такія падабраліся. Нездарма кажуць, што гэткіх крыклівых, як мы, яшчэ не было на факультэце.

«Крыклівых» трэба разумець, вядома, у пераносным сэнсе. Проста дзяўчаты актыўныя, усім цікавяцца, да ўсяго ім ёсць справа...

— Камсорг у нас — хоць куды, ад гэтага таксама многае залежыць, — ужо сур'ёзна дадае Наташа.

Камсоргам Валя Кудрашова ў групе не так даўно, але за гэты час яна паспела заваяваць сімпатыі сяброў.

— Часта бывае, што трэба застацца пасля заняткаў, — расказвае Лена Лугаўская, — а тут, як наўмысна, усе некуды спяшаюцца. Няма чаго грахі таіць, іншы раз паспрабуеш адкруціцца ад якога-небудзь мерапрыемства. У такіх выпадках Валя катэгарычна заяўляе: «Выбралі камсоргам — слухайцеся!» Падумаеш, дык і на самай справе так. Ёсць у яе арганізатарскія здольнасці, і характар цвёрды.

А наконт мерапрыемстваў, дык нездарма група лічыцца лепшай па камсамольскай рабоце. Прыйшла камусьці думка наладзіць конкурс на лепшае выкананне камсамольскай песні на факультэце. Сказана — зроблена. Пачатак добрай традыцыі пакладзен.

Неяк неўпрыкмет павялося пасля палітінфармацый расказваць пра выдатных людзей. Тут кожны бярэцца за тое, што яму больш да спадобы. Хочаш расказаць пра мастака — добра, пра пісьменніка — калі ласка! А калі каму-небудзь даводзіцца пабываць у цікавай паездцы, усе дружна застаюцца пасля заняткаў і гатовы слухаць расказчыка без канца.

**— Дарэчы, аб самадзейнасці,** — успомніла я, — колькі чалавек у ёй удзельнічае?

— Ды амаль усе, — у адзін голас адказалі дзяўчаты. Многія ў драмгуртку займаюцца, хлопцы ўсе ў хоры спяваюць, Лена Лугаўская ў капэле, Коля Каменка ў «Крыжачку» танцуе. (У ім я пазнала таго самага хлопца, які ліха танцаваў на сцэне аргенцінскае танга). І нікому яшчэ гэта не перашкаджала добра займацца. Наадварот, нават больш падцягнуліся ў параўнанні з мінулым годам.

Вядома, іншы раз і цяжкавата прыходзіцца. Трэба і да практычных рыхтавацца, і ў тэатр, у кіно схадзіць, ды і на спатканне таксама. І ўсё ж яны паспяваюць усюды. Як ім гэта ўдаецца? Па-мойму, тут ёсць цікавая заканамернасць. Даўно вядома, што чым больш людзі займаюцца грамадскімі справамі, тым лепш яны вучацца. Мабыць, адчуваюць, што ім нельга інакш. На іх жа раўняюцца! А яшчэ прывыкаюць да самакантролю, самадысцыпліны, правільна размяркоўваюць сілы і час. Так што сувязь паміж поспехамі ў вучобе і самадзейнасці аказалася прама прапарцыянальнай.

— А наконт таго, ці цяжка быць выдатнікам.., — сказала на развітанне Света Кашкарова, — не! Проста цікава вучыцца.

С. ТРУКШЫНА.

Па вечарах загараюцца вокны універсітэцкіх карпусоў: ідуць заняткі ў вячэрнікаў. Пасля рабочага дня іх чакаюць лекцыйныя і практычныя заняткі. А раніцой зноў на работу.

Гэта зусім не проста сумяшчаць службовыя і студэнцкія абавязкі. Але Тая Кавалёва, студэнтка IV курса вячэрняга аддзялення хімфака, не толькі добра вучыцца. Яна і стараста сваёй, II групы.

НА ЗДЫМКУ: Тая КАВАЛЁВА ля дошкі. Адказ яе, як заўсёды, выдатны.




НА ЗДЫМКУ: лекцыю па гісторыі дзяржавы і права замежных краін першакурснікам юрыдычнага факультэта чытае старшы выкладчык Людміла Васільеўна Паўлава. Фота **Д. Чаховіча.**

## КАЛЕКТЫЎ І Я

# НЯСТРОЙНЫ «ГАУДЭАМУС»

### ЯШЧЭ РАЗ ДА ПЫТАННЯ АБ МІКРАКЛІМАЦЕ Ў КАЛЕКТЫВЕ

МНЕ ЗДАЕЦЦА, не патрабуе доказаў тое, што паняцце «студэнцкія гады» для нас даўно ўжо раўназначна не толькі напружанаму засвойванню асноў навук, але і цікавым турысцкім паходам з іх рамантыкай, песнямі ля кастроў, бясконцым дыспутам з няспыннымі спрэчкамі ў пошуках ісціны, культпаходам і многаму-многаму іншаму.

Усё гэта — свайго роду закон. Але тут у сілу ўступаюць славутыя выключэнні, без якіх і няма, увогуле, ніводнага закона. Вось аб іх і пойдзе гутарка.

Па ўсіх паказчыках (паспяховасць, удзел у камсамольскім, грамадскім і спартыўным жыцці факультэта) трэцяя група II курса журфака знаходзіцца ў ліку сярэдніх, а дакладней — «не горшая за іншых». Гэта праўда. Але праўда і тое, што студэнты не задаволены становішчам спраў у групе. А выражаюць яны гэтую незадаволенасць лаканічнай, палохаючай сваёй прастатой фразай: «Не склаўся ў нас калектыў».

Ці так гэта? Паспрабуем разабрацца.

Студэнцкая група нараджаецца проста: адлічваюць па алфавітнаму спісу 25 — 30 чалавек — і група гатова. Жывіце, рабяты, у міры і згодзе.

Але лёгка сказаць — жывіце, калі воляй лёсу аб'ядноўваюцца людзі не толькі самых розных характараў, але і ўзростаў. І калі, напрыклад, Міша Ягела да паступлення ва універсітэт і вучыўся ў тэхнікуме, і адведаў «асабістага хлеба», і адслужыў у радах Савецкай Арміі, дык аўтар гэтых радкоў проста-такі перасеў са школьнай парты на парту студэнцкую. І, канешне, цяжка (але магчыма) такім людзям пасябраваць, пераадолець гэтую розніцу ва ўзросце. Вось і ў нас у групе хоць і няма раздзялення на «старых» і «моладзь», але няма і таго ўзроставага адзінства, якое цягне за сабой і адзінства поглядаў.

Напэўна, ніхто не будзе аспрэчваць, што ў кожным калектыве павінна быць аснова, касцяк, вакол якога і згуртоўваюцца астатнія. Мяркуецца, што аснову групы павінен скласці «ўсемагутны трохвугольнік»: стараста, камсорг, праўорг. У нас так не атрымліваецца: стараста аддае ўсе сілы беспаспяховай барацьбе за стопрацэнтнае наведванне, праўорг з галавой пятануў у здабыванні ўзносаў і толькі камсорг, Наталля Пятроўская імкнецца неяк згуртаваць нас, зрабіць жыццё ў групе цікавейшым, жывейшым, больш разнастайным.

Задача непасільная для аднаго. А мне здаецца, і прынцыповая, патрабавальная Таня Скібіцкая, і эмацыянальная Тома Ярашэвіч, і безадказны ў справе Лёша Цыгулёў, і ўдумлівая Света Шыдлоўская, і энергічная Маша Шымко, і непасрэдная Наташа Шчынская змаглі б узяць на сябе частку агульнага клопату і, цудоўна дапаўняючы адзін аднаго, стаць касцяком групы, які ўяўляе сабой пачатак калектыву.

Уся справа тут, відавочна, у тым, каб змагчы «захварэць» агульнымі спадзяваннямі і праблемамі, паставіць грамадскае вышэй асабістага, не адмяжоўвацца голай фразай «мне ў групе нецікава», а спрабаваць рабіць так, каб стала цікава і табе, і ўсім.

Патрэбны ініцыятыва, сапраўдная справа, а нам хапае энтузіязму пакуль толькі на абмеркаванне плана работы. Праўда, была сумесная паездка ў Раўбічы, быў групавы творчы вечар паэта-аднакурсніка У. Таляронка, але гэта так мала за амаль двухгадовы перыяд вучобы, калі кожны дзень нясе нам столькі новага і свежага.

Тут, відавочна, пара пагутарыць і аб ролі куратара ў студэнцкай групе. Бо іменна ён, педагог, выхавацель, чалавек з жыццёвым вопытам заклікан разглядзець у кожным з нас няхай амаль незаўважныя парасткі асобы, своеасаблівую «разынку», і, узгадняючыся з гэтым, накіраваць працэс нашага згуртавання ў калектыў.

На мой погляд, нашаму куратару гэта пакуль што не ўдалося. Ва ўсякім разе ўзаемаразумення мы яшчэ не дасягнулі, а без гэтага нельга ісці далей.

Мне могуць запярэчыць— так нельга: узваліў на куратара ўсю складанейшую работу па раскрыццю характараў, а самі студэнты стаяць у баку. Не, я якраз лічу, што іменна студэнты павінны стварыць у групе такую атмасферу, у якой раскрываюцца і расцвітуць усе характары, няхай нават самыя сціплыя, разаўюцца лепшыя якасці кожнага. Гэта. думаецца, важнейшая ўмова існавання калектыву.

І калі мы, напрыклад, даведваемся толькі зусім выпадкова, што Валя Старасціна — выдатны стралок, сярэбраны прызёр першынства універсітэта або што Таня Цікунова цудоўна іграе на піяніна, дык аб якой атмасферы адзінадушша і ўзаемаразумення мы можам цяпер гаварыць?!

Так што правы, напэўна, рабяты, гаворачы аб тым, што няма ў нашай групе калектыву, няма той дружбы, зацікаўленасці, без якіх студэнцкае жыццё губляе амаль ці не палову сваёй прыгажосці.

P. S. Аўтар вельмі далёкі ад думкі рашыць даным выступленнем праблему калектыву ў студэнцкай групе. Ён толькі выказаў свае, магчыма, спрэчныя меркаванні і быў бы рад працягу размовы.

А. АСТРОЎСКІ,
студэнт.

# ПАЧАТАК ТРАДЫЦЫІ

У гонар Дня Перамогі ў спартыўнай зале БДУ адбыўся турнір на кубак прафкома Белдзяржуніверсітэта. У турніры — ён праводзіўся упершыню — удзельнічалі мужчынскія і жаночыя каманды БДУ, БПІ, спортклуба МАЗ, БІНГ, ІФК, інстытута замежных моў і школьнікі, усяго 80 чалавек.

Мэта турніру — падрыхтаваць зборныя каманды універсітэта да рэспубліканскай спартакіяды вну.

Спаборніцтвы праходзілі на працягу трох дзён вельмі арганізавана і зладжана.

У выніку напружанай барацьбы вызначыліся пераможцы: сярод мужчын — каманда БДУ, сярод жанчын — каманда ІФК. Яны ўзнагароджаны памятнымі кубкамі прафкома БДУ і граматамі. Лепшым ігракам каманд уручаны памятныя сувеніры.

Удзельнікі турніру, прадстаўнікі і трэнеры каманд выказалі ўдзячнасць за арганізацыю спаборніцтва і пажадалі зрабіць яго традыцыйным.

С. МІКАЛАЙЧЫК.

# Насустрач 30-годдзю вызвалення Беларусі

## РАЗВЕДЧЫКІ

КОЖНЫ ГОД у першую нядзелю ліпеня ў Кайкаўскім лесе, дзе ў пачатку вайны прызямліўся на парашуце кадравы разведчык Чырвонай Арміі маёр Леанід Іосіфавіч Сарока, збіраюцца былыя партызаны. Час пасерабрыў іх скроні, адбіўся на тварах сеткаю маршчын, але ў кожнага столькі аптымізму, столькі маладога задору, такі жывы інтарэс у вачах да жыцця, што прыходзіць перакананне: старасці яны не падуладны. З сяброўскай, братэрскай шчырасцю і цеплынёй ветэраны апавядаюць адзін другому пра свае справы і жыццё, дзеляцца навінамі, разам успамінаюць баявыя мінулыя дні. Іх аб'яднала вайна, загартавала ў суровым вогненным горне.

Зараз у іх самыя мірныя прафесіі: выкладчыкі, заатэхнік, урач... І неяк не верыцца, што гэтыя прыветныя і шчырыя людзі ў грозны час фашысцкай навалы наводзілі жах на ворага, не давалі яму спакою ні днём, ні ноччу. Пад самым носам лютых карнікаў у Мінску дзейнічала разведвальна-дыверсійная група «Артур». Узначальваў яе Мікалай Пракопавіч Філановіч, палітруком быў Несцер Сямёнавіч Касцюк. Падгрупай «Цэнтр» кіраваў Іван Ануфрыевіч Мазанік, у падгрупе «Заходняя» працавалі брат і сястра Іван і Марфа Лагацкія, а ў падгрупе «Паўночная» тры браты—Іван, Ілья і Сцяпан Крукі. Шмат мужных людзей былі сувязнымі і радавымі разведчыкамі.

Аб іх у той грозны час не пісалі ў газетах, не называлі іх прозвішчаў па радыё. Хіба што ў скупых і лаканічных зводках Саўінфармбюро ўказвалася на вынікі іх неверагодна цяжкай работы.

З таго часу мінула тры дзесяцігоддзі. Зарубцаваліся раны, з руін і попелу велічна ўзняўся прыгажун Мінск, вырасла новае пакаленне людзей, але ў нашай памяці ніколі не памеркнуць вобразы мужных змагароў за свабоду Айчыны, тых, хто не пашкадаваў жыцця ў імя перамогі, і тых, хто сёння жыве побач з намі. Аб слаўных баявых справах спецгрупы «Артур», лёсе бясстрашных яе камандзіраў, разведчыкаў і расказваюць спецыяльныя выпускі вучэбнай газеты журфака «Журналіст».



## СУВЯЗНАЯ ЖАВАРАНАК

Дзяўчына падыходзіла да нямецкага паста. «Зараз пачнуць абшукваць», — пранеслася ў галаве.

Паліцэйскі праверыў дакументы. І ўжо збіраўся абшукваць яе адзенне. Але раптам заўважыў, што ногі і рукі дзяўчыны намазаны чымсьці чорным. Ён грэбліва адскочыў:

— Што гэта?

— Кароста... хвароба такая, — растлумачыла дзяўчына.

Вартавы злосна бліснуў вачыма:

— Праходзь, чаго стала!

Хацеў штурхнуць яе ў спіну, але, баючыся заразы, толькі вылаяўся ўслед. Дзяўчына хуценька пакрочыла далей.

Колькі разоў прыходзілася ісці праз нямецкія заслоны, і кожны раз трывожна ёкала сэрца, але на яе твары гэтага прачытаць было немагчыма.

— Ну і артыстка ты, Каця, — гаварылі ёй сябры-разведчыкі, гледзячы, як яна змывае з рук мазуту.

Праца яе сапраўды патрабавала артыстычных здольнасцей. Сувязная Кацярына Жаваранак рэгулярна дастаўляла ў спецгрупу каштоўныя звесткі з горада. Гэта была здольная на выдумку дзяўчына. Якімі толькі спосабамі яна не карысталася, каб пазбегнуць вобыску. Неаднойчы ашуквала нямецкіх вартавых, праносіла ў складках сукенкі шыфроўкі з разведданымі. Каця дастаўляла ў спецгрупу медыкаменты, прыносіла з горада неабходнае сябрам адзенне, прадукты харчавання.

Пастаянная рызыка патрабавала нервовага напружання. У атрад Кацярына прыходзіла зморанай, але пачуццё гумару, жыццярадаснасць ніколі не пакідалі яе.

Яна не дажыла да раданага дня перамогі. У чэрвені 1944 года адважная сувязная не вярнулася з задання. Кацю разам са старэйшай сястрой Аняй схапілі гестапаўцы. Дзяўчаты мужна трымаліся на допыце, не выдалі таварышаў. Гітлераўцы спалілі дзяўчат у Трасцянецкім лагеры смерці.

Л. ШЫГАНАВА.

● Фотарэпартаж Д. ЧАХОВІЧА.







Нядаўна студэнты біяфака ў сваёй падшэфнай школе № 1 г. Мінска правялі гутарку аб птушках і запрасілі рабят у заалагічны музей. Экскурсію па музею вялі студэнткі II курса А. Пікулік і Л. Бабіцкая.

Бездань цікавага заўсёды тоіць знаёмства з жывёльным светам.

**На здымках:** школьнікі ў заалагічным музеі БДУ.

# САВЕТЫ—ОРГАНЫ САПРАЎДЫ НАРОДНАЙ УЛАДЫ

### У ДАПАМОГУ ПРАПАГАНДЫСТУ

(Заканчэнне. Пачатак у № 14).

Ва ўсіх сваіх справах і пачынаннях, ва ўсёй сваёй палітыцы наша партыя абапіраецца на Саветы дэпутатаў працоўных як на паўнаўладныя дзяржаўныя органы на месцах. У сваю чаргу партыя пастаянна клапоціцца аб далейшым павышэнні ролі Саветаў.

Значна расшыраны правы абласных, гарадскіх і раённых Саветаў у галіне планавання, бюджэту, фінансавання прамысловасці, сельскай гаспадаркі, жыллёвага будаўніцтва, быту, устанаўлення рознічных цэн на прамысловую, сельскагаспадарчую прадукцыю, тарыфаў на перавозкі і паслугі, у галіне сацыялістычнай законнасці і аховы грамадскага парадку.

Адбываецца двуадзіны працэс: з аднаго боку, расшыраюцца правамоцтвы Саветаў, а з другога, умацоўваецца іх эканамічная база, чым забяспечваецца гарантыя здзяйснення правоў, прадастаўленых Саветам.

Расшырэнне правоў мясцовых Саветаў — гэта ленінскі дэмакратычны цэнтралізм у дзеянні, павышэнне ролі і аўтарытэту мясцовых органаў дзяржаўнай улады, важнейшы шлях паляпшэння кіраўніцтва палітычным, гаспадарчым і культурным будаўніцтвам.

Характэрнай асаблівасцю працэсу з'яўляецца тое, што з расшырэннем аб'ёму работы Саветаў, павышэннем адказнасці звужаецца іх сфера адміністратыўнага прымушэння. Асноўнымі метадамі работы Саветаў у сучасных умовах сталі перакананне, цярплівае растлумачэнне, заахвочванне ўсяго перадавога, лепшага, максімальны ўлік мясцовых умоў і рэсурсаў.

Цяпер любы Савет — вышэйшы орган улады на сваёй тэрыторыі, гаспадар горада, пасёлка або вызначанай тэрыторыі. Узровень вытворчага жыцця прадпрыемства, калгаса, саўгаса, гандлёвай арганізацыі стаў своеасаблівым крытэрыем у рабоце большасці мясцовых Саветаў рэспублікі.

Добра рыхтуе і праводзіць сесіі Савецкі раённы Савет г. Мінска. Задоўга да сесіі дэпутаты і насельніцтва знаёмяцца з павесткай дня, глыбока вывучаюць і абмяркоўваюць надзённыя праблемы.

Па-дзелавому была праведзена, напрыклад, сесія Савета, на якой абмяркоўвалася справаздача аддзела народнай асветы аб ажыццяўленні Закона аб поўным пераходзе да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі. За 15 дзён да сесіі ўсім дэпутатам былі разасланы праект рашэння і даклад. Сесія была выязной, яна праходзіла ў памяшканнях 23-й і 19-й сярэдніх школ г. Мінска. Дэпутаты азнаёміліся з вучэбнымі кабінетамі, з раённым метадычным кабінетам, выстаўкай дзіцячай тэхнічнай творчасці школ раёна. У школе № 19 яны агледзелі выстаўку дзіцячага жывапісу, вывучылі тэхнічнае аснашчэнне школы, работу прадпрыемстваў-шэфаў. А затым адкрылася пасяджэнне сесіі без даклада. Выступілі 13 дэпутатаў і гасцей, якія глыбока аналізавалі работу школ, прапагандавалі станоўчае і адзначалі недахопы.

На сесію былі запрошаны кіраўнікі ўсіх школ раёна.

Раённы Савет прыняў канкрэтнае рашэнне, якое паспяхова выконваецца.

Важная форма ўздзеяння Саветаў на развіццё прамысловасці — распрацоўка паказчыкаў сацыялістычнага спаборніцтва або агляду і падвядзенне вынікаў іх выканання. Добра наладжана гэта работа ў Віцебскім гарадскім Савеце. Пераможцы спаборніцтва шырока прапагандуюцца і заахвочваюцца.

Пытанні эканомікі сельскагаспадарчай вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці не сыходзяць з павесткі дня сесій і пасяджэнняў выканкомаў многіх Саветаў. Яны рэгулярна падводзяць вынікі сацыялістычнага спаборніцтва ў калгасах і саўгасах, заахвочваюць перадавікоў, праводзяць эканамічныя канферэнцыі, семінары і нарады з работнікамі сельскай гаспадаркі, аказваюць дапамогу калгасам і саўгасам у набыцці машын і запчастак да іх, мінеральных угнаенняў, будаўнічых матэрыялаў, у выдачы крэдытаў і інш.

Важным у рабоце Саветаў з'яўляецца прапаганда дасягненняў навукі і ўкараненне перадавога вопыту ў сельскагаспадарчую вытворчасць.

Эфектыўнай формай уздзеяння Саветаў на гаспадарчае і сацыяльна-культурнае развіццё з'яўляюцца пастаянныя камісіі, утвораныя з дэпутатаў. У мясцовых Саветах БССР налічваецца 10493 пастаянныя камісіі, у састаў якіх уваходзіць больш 67 тысяч дэпутатаў і звыш 100 тысяч актывістаў. З кожным годам расшыраецца кола пытанняў, якія камісіі рыхтуюць для разгляду на сесіях Саветаў і пасяджэннях выканаўчых камітэтаў.

Пастаянныя камісіі — гэта школа выхавання кадраў.

Саветы пастаянна ўздзейнічаюць на ўсе бакі грамадскага жыцця праз сваіх дэпутатаў. 20 верасня 1972 года Вярхоўны Савет СССР прыняў закон «Аб статусе дэпутатаў Саветаў дэпутатаў працоўных у СССР», згодна з якім значна пашыраны правы дэпутатаў. Умацоўваецца прававая абарона дэпутата. На яго распаўсюджваецца не толькі права недатыкальнасці. Ён не можа быць звольнен з работы па ініцыятыве адміністрацыі або выключан з калгаса без згоды Савета ці яго выканкома.

Дэпутат абавязан быць непрымірымым да ўсіх недахопаў, чулым і справядлівым.

Многія дэпутаты з'яўляюцца арганізатарамі і перадавікамі вытворчасці.

У практыку работы сельскіх і раённых Саветаў Беларусі ўвайшло прыняцце пятогадовых планаў культурна-бытавога будаўніцтва, а таксама мабілізацыя ўсіх сіл і сродкаў на іх выкананне. Будуюцца новыя школы, палацы культуры, камбінаты бытавога абслугоўвання, магазіны, сталовыя, бані, спартыўныя пляцоўкі, добраўпарадкоўваюцца дарогі, змяняецца выгляд вёсак. Раённыя і сельскія Саветы выступаюць ініцыятарамі спаборніцтва за лепшы населены пункт.

Такім чынам, Саветы дэпутатаў працоўных у інтарэсах народа паспяхова здзяйсняюць унутраныя функцыі Савецкай дзяржавы, накіраваныя на пабудову камуністычнага грамадства ў нашай краіне.

16 чэрвеня гэтага года, у нядзелю, адбудуцца выбары ў Вярхоўны Савет СССР. Выбары ў Саветы — усенароднае свята, выражэнне перамогі савецкай сацыялістычнай дэмакратыі. Праяўляючы маральна-палітычнае адзінства, савецкія людзі выберуць у вышэйшы орган улады краіны лепшых сыноў і дачок нашай Радзімы.

А. ГАЛАЎКО,
загадчык кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, доктар юрыдычных навук.

# СЭРЦА АДДАЦЬ ДЗЕЦЯМ

Невялікая Паўлышская сярэдняя школа, што ў Кіраваградскай вобласці на Украіне. Вішнёвыя сады кожнай вясной прыбіраюцца ў белы ўбор. Гэтак жа, як і раней, звініць залівіста школьны званок. Гэтымі прыступкамі кожную раніцу ішоў ён у свой клас, ішоў у свет дзяцінства як самы лепшы таварыш і дарадца маладой змены.

Акадэмік Акадэміі педагагічных навук, заслужаны настаўнік, Герой Сацыялістычнай Працы Васіль Аляксандравіч Сухамлінскі з 1944 года і да канца свайго жыцця нязменна працаваў дырэктарам вясковай школы, не паддаючыся ні на якія спакусы і прапановы. Усё сваё жыццё, усё сваё сэрца аддаў ён пачэснай справе выхавання моладзі. Як выхаваць цікавасць дзяцей да вучобы, як навучыць працаваць з радасцю, абудзіць і развіць у іх імкненне да прыгожага, выклікаць жаданне стаць сапраўдным чалавекам — гэтыя і іншыя вострыя праблемы педагогікі ён вырашаў усё сваё кароткае жыццё. Кнігі, артыкулы В. Сухамлінскага зачытваліся з ліхаманкавасцю, нават і сёння немагчыма дастаць яго творы. Чалавек, які валодаў амаль усімі еўрапейскімі мовамі і адной з самых цяжкіх у свеце — японскай, ён многія працы перакладаў асабіста.

Кожнае слова мудрага выхаваццеля прасякнута глыбокай заклапочанасцю пра чалавека нашага камуністычнага будучага.

Колькі год таму назад на нарадзе ўкраінскіх дзіцячых пісьменнікаў у Кіеве сустрэўся з В. Сухамлінскім наш беларускі паэт Васіль Вітка. Прага адкрыць дзіцячую душу, дапамагчы юнаму грамадзяніну знайсці сябе здружыла двух сабратоў па пяру — выхаваццеля - вучонага і пісьменніка. Сустрэчы, перапіска зблізілі невялікае Паўлышава і беларускую сталіцу. Васіль Вітка быў першым рэдактарам першых мастацкіх твораў выдатнага педагога, вучыў літаратурнаму майстэрству і сам вучыўся ў Сухамлінскага, знаходзіў у яго тэмы для новых і новых твораў. Таму так шчыра і прачула вёў свой расказ В. Вітка на сустрэчы са студэнтамі філалагічнага факультэта.

Успамінаем словы В. Сухамлінскага: «Калі ты хочаш стаць добрым выхаваццелем дзяцей—аддай ім сваё сэрца». Верым, што сэрца педагога назаўсёды з імі, яго вучнямі, як і яго пачэсная праца, што неўміруча будзе ахоўвацца нашчадкамі.

# НЕЗВЫЧАЙНАЯ ЛЕКЦЫЯ

У гэтым годзе спаўняецца 40 год з дня напісання Якубам Коласам славутай аповесці «Дрыгва». З таго часу вобраз смелага змагара супраць белапалякаў—дзеда Талаша—стаў сімвалам мужнасці і стойкасці беларускіх партызан, няскоранасці нашага народа перад захопнікамі. Аповесць шмат разоў перавыдавалася, перакладзена на дзесяткі моў свету.

Гэтая лекцыя на філалагічным факультэце была не зусім звычайная. У госці да студэнтаў прыйшлі сын дзеда Талаша Дзмітрый Васільевіч Талаш (Апанас у аповесці), навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Якуба Коласа Іван Курбека, дачка Героя Савецкага Саюза В. І. Казлова Вольга Васільеўна Казлова. Дзмітрый Васільевіч расказаў моладзі пра свайго бацьку, пра сустрэчы з В. Казловым. Падрабязна спыніўся ён і на прататыпах аповесці Я. Коласа «Дрыгва». Так даведаліся мы, што сапраўднае імя і прозвішча Максіма Рыля — Аляксей Кніга, што многія героі твора жывуць і цяпер, гадуюць унукаў і праўнукаў.

У заключэнне быў паказан навукова-папулярны кінафільм «Якуб Колас».

**М. ПРЫГОДЗІЧ.**

**ПАСЛЯ ВАЙНЫ прайшло шмат год, — сказаў у адным інтэрв'ю лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, народны мастак БССР Міхаіл Андрэевіч Савіцкі. — Сёння галоўнае, на мой погляд, паказаць не толькі асобныя эпізоды вайны, а ўнутраную прыгажосць савецкага чалавека, яго пачуцці ў самых цяжкіх выпрабаваннях, яго сілу духу. Паказаць сканцэнтравана, насычана, каб малюнак аб вайне прагучаў гэтак жа сучасна, як малюнак аб сённяшнім жыцці...**

Пройдзем па залах Дзяржаўнага мастацкага музея БССР, дзе адкрылася нядаўна выстаўка твораў М. Савіцкага. Нас сустрэнуць цвёрдыя і бясстрашныя, чыстыя, трывожныя і засмучаныя болем страт вочы. Выплаканыя вочы маці і вочы старога, прыплюшчаныя ад лютай нянавісці да ворага і жадання адпомсціць — гэта «Клятва». Поўныя дум і невыказнай трывогі ў час развітання вочы сталага мужчыны — «Партызаны». Колькі нянавісці ў позірку юнака, які імкнецца сабой засланіць сяброў, — «Камсамольцы». З мудрым спакоем чакаюць смерці вочы старога дзеда,

# ЗАПАДАЕ Ў ДУШУ СУСТРЭЧА



на грудзі якому фашысты павесілі дошку з надпісам «partisanen». Гэта вялікае палатно называецца «Пакаранне смерцю»... Вочы людзей вайны, людзей ужо такога, здаецца, далёкага ад нас часу.

Але праходзіць хвіліна, другая, і ты адчуваеш духоўную блізкасць сваю з гэтымі людзьмі, адчуваеш іх настрой, іх боль, іх гнеў, іх рашучасць. Усё гэта так блізка, так зразумела, так чалавечна. Ці не ў гэтым сіла сапраўднага мастацтва — у пранікненні ў душу гледача, у здольнасці прымусіць яго перажываць разам з аўтарам.

Вось апошняя работа мастака з серыі «Гераічная Беларусь». Адлюстроўвае яна эпізод, сведкай якога быў сам мастак у час вайны.

...Сярод хлебнага поля жменька савецкіх байцоў з апошніх сіл стрымлівае ворага. А фашыстаў усё больш і больш. Чорныя кропкі іх мундзіраў раскіданы па залатому полю.

Хлеб, сімвал жыцця, і... бой.

А зямля, яна родная. Родная! Як на падушку, упаў на яе мёртвы воін. Рукі раскінуў, нібы спіць. А побач забіты фашыст. Чорная, сагнутая фігура. Нож, сціснуты ў руцэ, злосна ўпіўся ў нашу маці-зямлю...

Да гэтага не застанешся раўнадушным. Ад карціны не адразу адыйдзеш.

Нездарма гавораць, што жыццё мастака — пралог да яго творчасці. Вобразы многіх сваіх герояў вынес Савіцкі з ваеннага юнацтва. А яно было суровым. Дваццацігадовы салдат ваяваў на Паўночным Каўказе. Потым у Севастопалі. Потым палон. Чатыры пабегі. Ні адзін з іх не ўдаўся. Допыты ў гестапа, пабоі, катаржныя работы, лагеры смерці. І заўсёды вакол людзі, вочы якіх потым ажылі на яго палотнах. А яшчэ жыве на іх нянавісць да вайны і прагная цяга да міру.

Мы не можам прасачыць творчы шлях мастака, які позна, толькі ў 25 год пачаў вучыцца жывапісу і толькі з 35 удзельнічае ў выстаўках (карціны змешчаны не ў храналагічным парадку). Але гэта і не трэба. Ва ўсіх залах палотны аб вайне размешчаны побач з карцінамі мірнай працы, апавяданнямі аб нашым сучасніку. І гэта апраўдана. Мы пераводзім погляд з маці ваеннага часу, якая вывозіць выратаваных дзяцей (карціна «Віцебскія вароты»), на маладую сучасную маці з апошняй карціны мастака «Куст руж». Побач з маладой жанчынай — старая, яе маці. Яна, безумоўна, перажыла вайну. Хто яна? Тая суровая, з трывожнымі вачыма маці, што сядзіць высока на возе з маленькімі дзецьмі ў «Віцебскіх варотах»? А можа, тая, што ў апошні раз схілілася ў бязмежным горы да загінуўшага дзіцяці перад тым, як апусціць яго ў брацкую магілу на карціне «Партызаны. Блакада». Невядома. Але мы цвёрда ведаем, што перад тым хлапчуком, якога пяшчотна прытуліла да сябе шчаслівая маці каля цудоўнага куста руж, ляжыць цудоўнае, шырокае жыццё, мір, здабыты такой цяжкай цаной. Ён не павінен ведаць страшэнных ваенных пакут, як не ведае іх ужо і яго маці.

За гэта змагаецца мастак.

**Т. АБРАМОВІЧ.**

ПАРАДЫ ЎРАЧА

# ШЛЯХ ДА ЗДАРОЎЯ І ДАЎГАЛЕЦЦЯ

Цывілізацыя дала нам шмат выгод, але яна ж прынесла нам высокі тэмп жыцця, інфармацыйную перагрузку, гіпадынамію.

У сучасным свеце самай адкрытай для пашкоджання аказалася сфера эмоцый, нашы нервы. Адсюль і парушэнні сну, шматлікія вегетатыўныя расстройствы, праз якія фарміруюцца такія «хваробы стагоддзя», як атэрасклероз, гіпертанічная хвароба, стэнакардыя, інфаркт міякарда, інсульт, язвенная хвароба.

Аднак проціборства з адмоўным уплывам цывілізацыі далёка не беднадзейнае. Дапамагае тут перш за ўсё культура цела, якая прадугледжвае ўсебаковае фізічнае развіццё чалавека, культуру харчавання.

Асноўнымі сродкамі фізічнай культуры і спорту з'яўляюцца гімнастыка (ранішняя, вытворчая, аздараўленчая), спартыўныя практыкаванні, хадзьба, катанне на лыжах, плаванне, турызм.

Для трэніроўкі і аздараўлення арганізма фізічныя практыкаванні прымяняліся даўно, аднак іх значэнне было навукова даказана толькі ў наш час.

Чым больш працуюць мышцы цела, тым больш прыходзіцца працаваць сэрцу. Вось чаму, трэніруючы мышцы, мы трэніруем і сваё

Мышцы, якія працуюць, лепш забяспечваюцца крывёй, чым мышцы, якія бяздзейнічаюць. Звычайна ў пакоі ў сасудзістым русле цыркуліруе 55—75 працэнтаў крыві, астатняя кроў знаходзіцца ў так званых дэпо: пячонцы, селязёнцы, скуры.

Пры фізічных практыкаваннях аб'ём працякаючай па сасудах крыві ўзрастае. У выніку паляпшаецца жыўленне тканак і абмен рэчываў у арганізме. Фізічныя практыкаванні не толькі садзейнічаюць паляпшэнню кровазабеспячэння сардэчнай мышцы, але і павялічваюць яе здольнасць выштурхоўваць большую колькасць крыві ў аорту не за кошт частаты сардэчных скарачэнняў, а за кошт іх сілы.

Пад уплывам сістэматычных фізічных практыкаванняў паляпшаецца і функцыя дыхальнага апарата. Жыццёвая ёмістасць лёгкіх павялічваецца, дасягае 5000—7000 см³. А гэта паляпшае лёгачную вентыляцыю, г. зн. павялічваецца колькасць выдыхаемага і ўдыхаемага паветра, што вядзе к узмацненню газаабмену ў арганізме.

Фізічныя практыкаванні дабратворна ўздзейнічаюць не толькі на работу сэрца і лёгкіх, але і на функцыі страўніка, кішэчніка, нырак і іншых органаў і сістэм. Таму кожнаму трэба так пабудаваць свой рэжым, каб у яго абавязкова ўваходзілі фізічныя практыкаванні.

Комплекс ГПА, уведзены ў дзеянне з 1 сакавіка 1972 года, поўнасцю ўлічвае патрабаванні сённяшняга дня і задачы, пастаўленыя XXIV з'ездам КПСС у галіне фізічнага выхавання і спорту.

У комплексе ГПА сканцэнтравана дзейсная праграма фізічнага ўдасканалення. Па яго прыступках крочаць да здароўя, бадзёрасці, творчага даўгалецця людзі розных узростаў.

**Р. БАРШЧОВА.**





### ● ФОТАРЭПАРТАЖ

Для замежных студэнтаў, што навучаюцца ў БДУ, Мінск—не толькі крыніца ведаў. Наша сталіца вабіць сваімі прыгожымі плошчамі, паркамі, славутасцямі. Але ў моладзі з Азіі, Афрыкі найбольшую цікавасць выклікаюць дасягненні нашай прамысловасці, знаёмства з працоўнымі калектывамі.

**На здымку:** студэнты падрыхтоўчага факультэта на Мінскім гадзіннікавым заводзе.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

# У ЛІТАРАТУРНЫМ АДЛЮСТРАВАННІ

Выстаўкі — своеасаблівае люстэрка работы бібліятэкі. Па іх можна меркаваць, як аператыўна адклікаецца яна на знамянальныя падзеі нашага жыцця, як знаёміць свайго чытача з актуальнымі праблемамі часу, з жыццём і творчасцю цікавых людзей. Тэматычных і юбілейных выставак у бібліятэцы бывае каля 150 за год. І гэта не проста лічба. За ёй—велізарная работа нашых бібліятэкараў, якая патрабуе і ведаў, і вопыту.

Самая вялікая юбілейная выстаўка сёлета была прысвечана 104-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і называлася: «Справа Леніна жыве і перамагае». Яна складалася з трох раздзелаў: «Мары—у рэчаіснасць», «У. І. Ленін ва ўспамінах сучаснікаў», «Народы свету аб Леніне». Літаратура, якую рэкамендавала выстаўка наведвальнікам, шматбакова раскрывала вобраз вялікага правадыра. Шырока прадстаўлены былі выданні класікаў марксізму-ленінізму і кіраўнікоў нашай партыі.

«Мір, праца, май» — так называецца выстаўка, падрыхтаваная да Міжнароднага дня салідарнасці працоўных. Яна выразна паказала, якую вялікую работу вядзе наша партыя па ўмацаванню міру ва ўсім свеце.

«Свята Перамогі» — кніжная экспазіцыя аб подзвігу нашага народа, аб тых, хто прайшоў нялёгкім шляхам вайны, аб тых, хто самаадданa працаваў у тыле, аб тых, хто аддаў жыццё ў імя свабоды нашай Радзімы. Прысвячалася яна 29-й гадавіне разгрому фашысцкай Германіі.

Можна ўспомніць і іншыя цікавыя выстаўкі. Былі задаволены чытачы падборкай кніг да XVII з'езда ВЛКСМ. Многа зацікаўленых сабралі выстаўкі, прысвечаныя Дню тэатра і Дню касманаўтыкі, тым больш, што падабраныя кнігі выдаваліся жадаючым непасрэдна з выстаўкі.

Прапагандуюць работнікі бібліятэкі і літаратуру аб брацкіх краінах сацыялізму. З двух раздзелаў складалася выстаўка, прымеркаваная да дзён польскай культуры ў СССР. Адзін з іх расказваў аб палітычным і эканамічным жыцці Польшчы, другі — аб яе культуры, літаратуры, мастацтве. Рыхтуецца выстаўка, прысвечаная тыдню балгарскай культуры і мастацтва.

Яркім, вобразным паказам кніг адзначыць бібліятэка 30-годдзе з дня вызвалення Беларусі, Дзень савецкай моладзі, 175-годдзе з дня нараджэння А. С. Пушкіна.

Клапоцяцца арганізатары выставак і аб іх знешнім афармленні; робяць усё, каб зацікавіць чытачоў, дапамагчы ім знайсці патрэбныя кнігі.

**Т. МЕЛЬНІКАВА,**

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**

Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ём—1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Тыраж 2000 экз.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 11181

Зак. 671.